**Урок беларускай мовы па тэме «Словы, якія абазначаюць прадметы» (2 клас)**

**Наталля Іванаўна Вайцяхоўская,**
настаўнік пачатковых класаў
першай кваліфікацыйнай катэгорыі
Дварчанскай БШ Свіслацкага раёна

**Урок распрацаваны з выкарыстаннем прыёмаў "воблака слоў", "кластар", гульнявой тэхналогіі, ІКТ, прымяненнем парнай, групавой, індывідуальнай форм работы.**



**Задачы:** фарміраваць уяўленне пра словы – назвы прадметаў, уменне адрозніваць гэтыя словы, узбагачаць слоўнікавы запас, пазнаёміць з новым слоўнікавым словам *памяць;* развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць любоў і павагу да сваёй Радзімы, да продкаў.

**Абсталяванне:** падручнік, камп'ютар, карткі са словамі, карткі з заданнямі, кніга "Памяць", карткі "Воблака слоў", ілюстрацыі дрэва, кветкі яблыні.

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап**

**Настаўнік**. Празвінеў ужо званок,
Вас паклікаў на ўрок.
Хай занятак будзе плённы
І цікавы, і натхнёны.
Поспехаў я вам жадаю,
Калі што, я паспрыяю.

**II. Этап праверкі дамашняга задання**

Прачытаць прыказкі, растлумачыць іх сэнс. Назваць словы з супрацьлеглым значэннем, якія падкрэслілі.

Самаацэнка па шкале.

**III. Этап актуалізацыі ведаў**

Над якім раздзелам мы зараз працуем? (*Слова.*)

***Гульня "Так ці не"***

Калі сцвярджэнне правільнае, паказваем пальцамі "+", калі сцвярджэнне няправільнае – паказваем пальцам "-".

1) Кожнае слова мае значэнне (+).

2) Значэнне слова можна ўдакладніць у арфаграфічным слоўніку (-).

3) Усе словы могуць мець толькі адно значэнне (-).

4) Розныя па гучанні і напісанні словы могуць мець аднолькавае або блізкае значэнне (+).

5) Словы *вораг* і *сябар* – словы супрацьлеглыя па значэнні (+).

***Хвілінка чыстапісання***

– Запішыце злучэнні літар у сшыткі.

*Прмг  пдзвг  Рдзм  нрд  пмць*

Расшыфруйце словы, у якіх збеглі галосныя літары.

(*На дошцы вывешваюцца паступова карткі са словамі* ***Перамога, подзвіг, Радзіма, народ, памяць.***)

– Як вы лічыце, з якім святам асацыіруюцца гэтыя словы?

Значыць, да якога вялікага свята рыхтуюцца жыхары нашай краіны? (*Да Дня Перамогі.*)

– Колькі гадоў спаўняецца ў 2025 годзе з Дня Перамогі над ворагамі? (*80 гадоў, карцінка на экране.*)

– Якія слоўнікавыя словы сустрэліся? (*Радзіма, подзвіг.*)

– Яшчэ адно для вас новае слоўнікавае слова – *памяць.*

– А што такое памяць? (*Адказы вучняў.*)

– Якое яшчэ значэнне мае слова памяць, вы даведаецеся пазней, у час выканання заданняў.

*(Вучні запісваюць словы ў сшыткі.)*

**IV. Этап вывучэння новых ведаў**

– Сёння мы працягваем падарожнічаць па раздзеле "Слова" і папоўнім сваю капілку ведаў. Паставім пытанні да запісаных слоў і вызначым тэму ўрока.

- ✓ На якія пытанні адказваюць словы? *(Хто? Што?)*
- ✓ Вспомним из уроков русского языка: слова, которые отвечают на вопрос *кто? или что?,* что они обозначают? *(Предметы.)*

– Значыць, тэма нашага ўрока – словы, якія абазначаюць прадметы.

– Паставім мэты на ўрок па апорных словах *(карткі вывешваюцца на дошцы)*

Даведаемся…

Навучымся…

Работа з правілам стар. 105.

– Якія словы адказваюць на пытанне *што? (хто?)*

*(Работа з апорнай табліцай, складаецца кластар.)*

**Словы якія абазначаюць прадметы**

**хто?**

**што?**

**абазначаюць назвы**

**абазначаюць назвы**

**людзей**

**мэблі**

**раслін**

**транспарту**

**жывёл**

**з'яў прыроды**

**Фізкультмінутка**

https://yandex.by/video/preview/2544119321250645305

**V. Этап замацавання**

Пр. 140. *(Работа ў парах.)*

Прачытайце верш, вусна дапоўніце яго патрэбнымі словамі. Карыстайцеся словамі для даведкі.

Абмяркуйце заданне, працуючы ў парах.

– Якога слова не хапае?

– Што абазначаюць словы, якія вы ўставілі?

– На якія пытанні яны адказваюць?

Пр. 141.

– Што такое памяць?

Знайсці адказ на гэта пытанне вам дапаможа тэкст практыкавання.

*(Настаўнік дэманструе кнігу “Памяць”.)*

Выпісаць словы, якія адказваюць на пытанне *хто?, што?*

*(Выканаць заданне па варыянтах.)*

*Узаемаправерка.*

*Узаемаацэнка.*

**Фізкультмінутка для вачэй**

Работа ў групах.

1-я група – пр. 142.

Выпісаць назвы прафесій і дапоўніць іншымі.

2-я група. Дапоўніць прыказкі патрэбнымі словамі, выкарыстоўваючы прыём “воблака слоў”.




Радзіма –…  , чужына –…   .

Дарагая тая…, дзе радзіла мяне … .

Той …, хто за Радзіму … .

3-я група. Размеркаваць словы ў адпаведнасці з пытаннямі.
https://learningapps.org/2135820

Прэзентацыя работы груп.

**VI. Этап кантролю і самакантролю**

Выканаць тэст.

1. Выберыце правільнае выказванне:

Словы, якія абазначаюць прадметы, адказваюць на пытанні:

а) які? якая? якое? якія?

б) хто? што?

2. Вызначце словы, якія абазначаюць прадметы:

а) краіна

б) прыгожая

в) зямля

3.Словы *матуля, вучань, беларус, зязюля* адказваюць на пытанні:

а) хто?

б) што?

4. Вызначце, да якой групы адносіцца выдзеленае слова ў сказе**:**

**Зубр –** сімвал Беларусі.

а) з’ява прыроды

б) жывёла

в) расліны

5. Вызначце колькасць слоў, якія абазначаюць прадметы ў сказе**: *На свята Перамогі пасадзілі новыя кветкі.***

а) 4

б) 3

в) 5

Узаемаправерка па ключы.

1. б)

2. а), в)

3. а)

4. б)

5. б)

**VII. Этап інфармацыі пра дамашняе заданне.**
Пр.144. Дапоўніць прыказкі патрэбнымі словамі і запісаць. Падкрэсліць словы, якія абазначаюць прадметы.
**VIII. Этап падвядзення вынікаў урока. Рэфлексія**

- ✓ Успомні мэты, якія ставілі на пачатку ўрока?
- ✓ Ці дасягнулі вы іх?
- ✓ Што новага даведаліся на ўроку?
- ✓ Што выклікала цяжкасці?
- ✓ З якім слоўнікавым словам пазнаёміліся на ўроку?
- ✓ Аб чым сведчыць гэтае слова?
- ✓ Да якога вялікага свята рыхтуюцца жыхары нашай краіны?

Лічыцца, што сімвалам Перамогі з’яўляецца кветка яблыні. (*Дадатак 2*)
У вас на партах ляжаць кветкі яблыні.

Калі вам было цікава на ўроку, вы вельмі добра працавалі, у вас ўсё атрымалася, прымацуйце кветку зверху на дрэве.

Калі вам было цікава, добра працавалі, але вы маглі працаваць лепш, у вас не ўсё атрымалася, прымацуйце кветку пасярэдзіне дрэва.

Калі вам было не цікава, у вас нічога не атрымалася, прымацуйце кветку пад дрэвам.

Вось якое прыгожае атрымалася дрэва Перамогі.

## Літаратура

1. Антановіч Н. М., Антонава Н. У. “Беларуская мова”: падручнік для 2 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / Н. М. Антановіч, Н. У. Антонава – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2022 – Ч. 2. – 147 с.
2. Памяць: Свіслацкі р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: І. І. Варанец [і інш.]. – Мн. : Беларусь, 2004. – 526 с.
3. Песня [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: **https://yandex.by/video/preview/2544119321250645305** . – Дата доступу:15.04.2025
4. Практыкаванне [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://learningapps.org/2135820 . – Дата доступу:15.04.2025
5. Прыказкі аб Радзіме [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://ddu372.minsk.edu.by/be/main.aspx?guid=14291. – Дата доступу:15.04.2025

6. Суднік М. Р., Крыўко М. Н. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы/ М. Р. Суднік, М. Н. Крыўко –2-е выд. – Мн. : БелЭн, 1999. – 784 с.



